объединение не добилось больших успехов, так как братский хор просуществовал всего лишь несколько лет.

**Заключение.** Таким образом, 8 марта 1898 г. было открыто Мстиславское отделение Могилевского Богоявленского братства. Деятельность рассматриваемого объединения в 1898–1904 гг. выразилась в распространении среди населения религиозно-нравственной литературы и предметов церковного характера, устройстве народных чтений, библиотек, организации церковного хора. Вся активность Мстиславского отделения была направлена на укрепление позиций Русской Православной Церкви на Мстиславщине.

### СПИСОК ЦИТИРОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


1. Курневич, П. Открытие в г. Мстиславле отделения Могилевского церковно-православного Богоявленского братства (корреспонденция) / П. Курневич // Могилевские епархиальные ведомости. – 1898. – № 10–11 (часть неофициальная). – С. 148–156.
2. Устав Мстиславского отделения Могилевского церковного Богоявленского братства // Могилевские епархиальные ведомости. – 1898. – № 10–11 (часть официальная). – С. 79–85.
3. Мстиславское отделение Могилевского церковно-православного Богоявленского братства; его состояние и деятельность с 8-го марта 1898 по 1 февраля 1899 г. (первый год существования) // Могилевские епархиальные ведомости. – 1899. – № 11–12 (часть официальная). – С. 119–136.
4. Мстиславское отделение Могилевского Церковно-Православного Богоявленского братства (второй год существования) // Могилевские епархиальные ведомости. – 1900. – № 10 (часть официальная). – С. 129–142.
5. Отчет Мстиславского отделения Могилевского церковно-православного Богоявленского братства за 1904 год (7 со времени его учреждения) // Могилевские епархиальные ведомости. – 1905. – Приложение к № 6 (часть официальная). – С. 1–11.
6. Отчет Мстиславского отделения Могилевского Церковно-Православного Богоявленского братства за 1900 год (третий год существования) // Могилевские епархиальные ведомости. – 1901. – № 9 (часть официальная). – С. 62–79.
7. Деятельность двух отделений братства – Гомельского и Мстиславского // Могилевские епархиальные ведомости. – 1902. – № 9–10 (часть официальная). – С. 66–72
8. Деятельность двух отделений братства – Гомельского и Мстиславского // Могилевские епархиальные ведомости. – 1903. – № 9–10 (часть официальная). – С. 80–84.


*Материал поступил в редакцию 10.10.14*

***VOSOVICH S.M.*** **Cultural and educational activity of Mstislavsky office of the Mogilyov Bogoyavlensky brotherhood in 1898–1904**

The article examines the development of Mogilev orthodox Bogoyavlenski brotherhood Mstislavski division in 1898–1904. The guidelines of cultural and educational work of the above-said brotherhood division in the considered period are analyzed. The conclusion is made that all the activities of Mstislavski division was aimed at strengthening the positions of Russian Orthodox church in Mstislavski region.

УДК 94,438 (“1921–1927”)

***Гарматны В.П.***

# НЭП НА БЕЛАРУСІ (1921–1927)

**Уводзіны.** Да 1921 г. тэрыторыя БССР складалася з 6 паветаў былой Мінскай губерні: Мінскага, Бабруйскага, Барысаўскага, Мазырскага, Ігуменскага і Слуцкага (каля 52 300 кв. км.). Толькі пасля далучэння ў 1924 г. 18 уездаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў і перадачы ў 1926 г. Гомельскага і Рэчыцкага ўездаў стала магчымым пасяховае развіццё БССР як адзінага гаспадарчага комплексу, аднак Беларусі так і не былі вернуты многія яе этнічныя тэрыторыі. Першая Сусветная (1914–1918) і Савецка-польская (1919–1921) войны прывялі да велізарных разбурэнняў і заняпаду эканомікі Беларусі, якая пацярпела больш за ўсіх у былой Расійскай Імперыі. Балюча адчуваўся адрыў заходніх рэгіёнаў, якія знаходзіліся пад кантролем Польшчы, а таксама разрыў трывалых, яшчэ дарэвалюцыйных эканамічных сувязяў Беларусі з Польшчай і Прыбалтыкай [3, с. 3]. У гэты час наспела змена курсу ў сувязі з цяжкім эканамічным становішчам Савецкай краіны і незадавальненнем істотнай часткі яго насельніцтва, якое вылівалася ў рознага роду формы супраціву, у тым ліку і ўзброеныя.

Палітыка “ваеннага камунізму” не магла вывесці савецкія рэспублікі з найцяжэйшага эканамічнага крызісу, патрабаваліся новыя метады кіравання народнаю гаспадаркаю, таму ў сакавіку 1921 г. прайшоў X з’езд РКП(б), на якім у краіне была абвешчана новая эканамічная палітыка (НЭП). НЭП стала пераходнаю мераю на шляху ад капіталізму да сацыялізму, заменаю палітыкі “ваеннага камунізма” [7, с. 149]. НЭП мела на ўвазе ўмацаванне саюзу рабочых і сялян на эканамічнай аснове, развіццё прамысловасці на базе электрыфікацыі, выкарыстане таварна-грашовых адносін, паслабленне аграрнай палітыкі, часовы допуск капіталістычных элементаў у эканоміку з мэтаю выхаду яе з крызіса, адначасова ўлічваліся эканамічныя, палітычныя і прыродныя асаблівасці рэгіёнаў. НЭП выступіла ў якасці найбольш зразумелай і прывабнай для сялян шляха пераходу да сацыялізму [5, с. 114].

У 1921 г. быў адноўлены Дзяржаўны банк (Дзяржбанк) і створана сетка спецыялізаваных банкаў, якія канкурыравалі паміж сабою, што было востра неабходна ў катастрафічных пасляваенных умовах. Дзякуючы гэтаму адною з першых у савецкіх рэспубліках была праведзена грашовая рэформа, якая мела мэтаю стварыць глебу для правядзення наступных рэформ і праводзілася ў некалькі этапаў. У выніку, ў канцы 1922 г. Дзяржбанк выпусціў новыя грашовыя знакі – чырвонец (прыкладна 7,74 грам чыстага золата), які стаў значна больш устойлівым, чым папярэднія “саўзнакі”, і садзейнічаў выхаду эканомікі з глыбокага крызісу. Адзін рубель узору 1923 г. прыроўніваўся да 1 000 000 былых рублёў ці 100 рублёў узору 1922 г.

На пачатку 1920-х гг. асноваю эканомікі Беларусі заставалася сельская гаспадарка, прадукцыя якой у гэты час складала менш паловы даваеннай. Каля паловы ўсёй прамысловай прадукцыі выпускалі саматужнікі і рамеснікі. Трэба заўважыць, што цяжкае становішча ў эканоміцы краіны ў 1921–1922 гг. ускладнялася масавым палітычным і крымінальным бандытызмам. Дзеля выхаду сельскай гаспадаркі краіны з заняпаду, савецкім кіраўніцтвам быў прыняты шэраг пастаноў, якія павінны былі стымуляваць развіццё асабістай сельскай гаспадаркі: замена харчразвёрсткі харчпадаткам, зніжэнне аб’ёмаў нарыхтовак, павышэнне закупачных коштаў, паслабленне падатковага цяжару. У галіне сельскай гаспадаркі НЭП – гэта ў першую чаргу пераход ад харчразвёрсткі, у выніку ажыццяўлення якой у селяніна не заставалася нават насення на новы гаспадарчы год, да харчпадатка, памер якога быў амаль удвая меншым, быў цвёрда вызначаным яшчэ да пачатку сельскагаспадарчых работ і залежаў ад

***Гарматны Віталь Пятровіч,*** *магістр гістарычных навук, аспірант навучання кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт”.*

плошчы пасеваў, што спрыяла зацікаўленнасці беларускага сялянства ў павышэнні збораў асабістага ўраджаю. Акрамя збожжавых, натуральным падаткам абкладалася прадукцыя жывёлагадоўлі: мяса, масла, воўна, яйкі і г.д., але пазней яны былі заменены адзіным грашовым падаткам [2, с. 330].

Для БССР, дзе ў 1920–1923 гг. 89,4% насельніцтва складалі сяляне, а іх шчыльнасць была амаль самаю высокаю ў СССР, адной з найбольш актуальных праблем заставалася павелічэнне памераў асабістых сялянскіх надзелаў [3, с. 3]. На 1922 г. 57,2% сялянскіх гаспадарак Беларусі мелі надзелы ад 0,25 да 0,75 дзесяцін на душу (бедныякі), 34,4% – ад 1 да 1,5 дзесяціны (серадрнякі). Каб больш-менш эфектыўна развіваць асабістую гаспадарку, селяніну неабходна было мець не менш за 4,6–6,35 дзесяцін на кожнага з членаў сваёй сям'і, што мог сабе дазволіць далёка не кожны гаспадар.

Паводле дадзеных афіцыйнай статыстыкі СССР, агульная ўраджайнасць у гэты час у БССР складала каля 8–9 цэнтнераў (50-55 пудоў) з дзесяціны, што стала амаль самым нізкім паказчыкам у СССР. Трэба адзначыць, што такое становішча было абумоўлена недахопам угнаенняў, інвентару, рабочай жывёлы, сельскагаспадарчых машын. Паступова ўраджайнасць збожжавых у БССР расце, але маруднымі тэмпамі: на 1923 г. самая высокая ўраджайнасць назіралася ў Слуцкім уездзе – 9,2 цэнтнеры (57,4 пуды), Ігуменскім – 8,3 (51,78), Бабруйскім – 7,8 (48,83 пуды) з дзесяціны. У астатніх рэгіёнах рэспублікі ураджайнасць была яшчэ ніжэйшай. Ураджайнасць бульбы ў рэспубліцы ў гэты час складала 87 цэнтнераў з дзесяціны.

У 1922 г. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК) БССР прыняў закон аб працоўным землекарыстанні, які стаў першым юрыдычным актам, што ўзаконіў права сялян на арэнду зямлі і на выкарыстанне наёмнай працы на тэрыторыі БССР. У сакавіку 1923 г. рэспубліканскі ЦВК зацвердзіў Зямельны кодэкс, які дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі да 1925 г., калі ў сувязі з узбуйненнямі быў прыняты новы зямельны закон. Наркам земляробства БССР Д.Ф. Прышчэпаў (1925–1929 гг.) арыентаваўся на стварэнне хутарскіх і водрубных гаспадарак разам з падтрымкаю калектыўных. Для развіцця эканомікі рэспублікі важнае значэнне мела павышэнне прадукцыйнасці працы сялянства і рабочых, пераадоленне інфляцыі і выкарыстанне рынка ў якасці галоўнага эканамічнага рэгулятара.

Працэнт гаспадарак, якія скарысталі свае права на выкарыстанне наёмнай працы на сярэдзіну 1920-х гадоў, заставаўся невялікім: на 1925 г. толькі 4,3% усіх сялян карысталіся працаю падзёншчыкаў, але на 1926 г. іх было ўжо каля 14,3%. Пры гэтым трэба адзначыць, што частка такіх дамоў паміж сялянамі заключалася вусна і таму не была ўлічана афіцыйнай статыстыкай. На 1926 г. сярэдні заробак наёмнага работніка (батрака) складаў у бядняцкіх гаспадарках 5 рублёў у месяц, серадняцкіх – 5–6, заможных – 7–8 рублёў, але заробак мог выплачвацца і ў натуральным выглядзе. Дзеля параўнання, рабочы ў Віцебскай акрузе за дзень зарабляў у сярэднім 2 рублі 21 капейку, але трэба ўлічыць, што ў вёсцы наймальнік рабочай сілы, акрамя заробку, даваў работніку прытулак, вопратку, карміў яго. На 1925 г. продаж сваёй рабочай сілы, па афіцыйным дадзеным служыў крыніцаю для існавання 50 000 батракоў [4, с. 219–220].

У 1925 г. сельская гаспадарка Беларусі ў асноўным дасягнула даваеннага ўзроўню. У 1926 г. кошт усёй валавой прадукцыі ў даваеннай ацэнцы склаў 384,8 мільёны рублёў і перавысіў сярэднегадавыя паказчыкі 1911–1913 гг. на 9,8%. Насельніцтва рэспублікі было забяспечана хлебам (каля 180 кілаграм збожжа на 1 чалавека ў горадзе і 220 кілаграм на 1 чалавека ў вёсцы). Гараджане за год сталі спажываць даволі значна больш мяса – 41 кілаграм (сярэдняе спажыванне мяса ў 1913 г. – 29 кілаграм). З 1921 г. па 1926 г. спажыванне малака ў сельскай мясцовасці павялічылася ў 2 разы, масла – у 3, цукру – больш чым у 8, рыбы – амаль у 12 разоў. У 1926 г., згодна дадзеных ЦСУ БССР, усе збожжавыя культуры далі зніжэнне збору ўраджаю на 6,7%, дэфіцыт хлеба і фуражу склаў 12,7 мільёна пудоў [1, с. 41, 46].

У перыяд НЭПа сяляне засявалі асноўную частку сваіх зямель пераважна збожжавымі культурамі, бульбаю, ільном і каноплямі. Вялікую частку кармоў давалі сенакосы і пашы. Нягледзячы на вялікую ўдзельную вагу збожжавых у структуры пасяўных плошчаў, вытворчасць уласнага збожжа для патрэб рэспублікі была відавочна недастатковаю, таму на працягу 1926–1928 гг. у БССР звычайна дастаўлялі каля 152 000–318 000 тон збожжа, а бульбы накіроўвалі ў іншыя рэгіёны СССР па 15 900–37 900 тон, ільнавалакна – 4 000 тон, ільнанасення – 2 700 тон.

Уяўляюць цікавасць таксама і бюджэты сялянскіх гаспадарак. На 1926 г. у сярэднім на гаспадарку прыходзілася капітала на 1 200 рублёў (жывёла, пабудовы, інвентар, вытворчыя запасы і г.д.). Валавы прыбытак на гаспадарку складаў 931 рубель, а бягучыя затраты на вытворчасць – 459 рублёў (без уліку кошту асабістай працы). Увесь умоўна-чысты бягучы прыбытак складаў 591 рубель, акрамя таго, на гаспадарку прыходзілася таксама 15,6 рублёў падатку.

Рынкавы абарот ад продажу і абмену прадукцыі складаў 195 руб, з іх амаль 60% займалі тавары прамысловай вытворчасці і 27% прадукцыя жывёлагадоўлі. З набываемых прамысловых тавараў 24% ішло на гаспадарчыя патрэбы і 76% для асабістага ўжытку. Перавышэнне рынкавага абароту куплі тавараў над рынкавым абаротам рэалізацыі тавараў тлумачыцца актывізацыяй вытворчай дзейнасці сялян, ростам асабістага спажывання.

У 1928 г. агульная колькасць жывёлы была вышэй за 1916 г. у 1,4 разы і на 20,5% за 1924 г. У жывёлагадоўлі асноўнае месца ў структуры валавой прадукцыі займае малако, малочныя прадукты, мяса. З 1927 г. жывёлагадоўля пачынае дамінаваць за кошт пастаяннага росту рэалізацыі мяса і мясапрадуктаў. У цэлым прадукцыя сельскай гаспадаркі Беларусі ў бягучых коштах 1928 г. у адносінах да 1926 г. павялічылася на 24,3%. Аб паказчыках пагалоўя свойскай жывёлы на 1928 г. сведчыць наступная табліца:

Паказчыкі агульнага пагалоўя свойскай жывёлы БССР на 1928 г.

| Від жывёлы | Колькасць галоў (у тысячах) |
|---|---|
| Буйная рагатая жывёла | 2 200,2 |
| (у тым ліку каровы) | 1 346,2 |
| Свінні | 2 293,3 |
| Авечкі і козы | 3 449,3 |
| Коні | 1 091,9 |
| Пагалоўе жывёлы на 100 га ворных зямель, галоў | 51,2 |

Матэрыяльна-тэхнічная база сялянскіх і калгасных гаспадарак заставалася слабою: у сярэднім на сялянскую гаспадарку на 1927 г. прыходзілася 0,94 плуга, 1,1 барана, па 0,05 малацілкі і веялкі, 1,02 ваза на драўляным альбо жалезным ходу. Колькасць інвентара несупынна павялічвалася. Неабходна адзначыць, што ў гэты час налічвалася 159 машынных кааператываў (таварыстваў). Структура асноўных фондаў выглядала наступным чынам: рабочая і прадуктыўная жывёла складала 36%, вытворчы інвентар – 12%, сельскагаспадарчыя і фабрычназавадскія пабудовы – 24%, жылыя пабудовы – 28% [6, с. 31–32].

Вялікая ўвага ў перыяд НЭП надавалася савецкім кіраўніцтвам і прамысловасці, якая магла распачаць вытворчасць самых дэфіцытных тавараў, а сельскую гаспадарку забяспечыць усім неабходным абсталяваннем. Паколькі буйная прамысловасць не магла быць адноўлена без вялікіх капіталаўкладанняў, пачаць гэты працэс можна было стымулюючы спачатку развіццё дробнай і сярэдняй прамысловасці. Згодна дэкрэту ВЦВК РСФСР "Аб мерах садзейнічання саматужнай вытворчасці" ад 25 красавіка 1919 г., дробныя рамеснікі і саматужныя вытворцы вызваляліся ад нацыяналізацыі і муніцыпалізацыі, мясцовым органам улады прадпісвалася ўсяляк спрыяць наладжванню саматужнай прамысловасці.

У саматужнай прамысловасці БССР традыцыйна склалася раённая спецыялізацыя. Так, па справаздачам аб дзейнасці ўездных саматужніцкіх камітэтаў можна адзначыць, што, напрыклад, у Барысаве развівалася перш за ўсё ганчарная вытворчасць, у Слуцку – вытворчасць земляробчага інвентара, у Мазыры –

дрэваапрацоўка, у Мінску – мылаварства, войлачная, вяроўкавая, гільзавая, ювелірная вытворчасць і г.д.

Трэба адзначыць, што дзяржава прыкладала вялікія намаганні, каб аб'яднаць усіх саматужнікаў у вытворчыя кааператывы і ўзяць іх пад свой кантроль. На тых рамеснікаў, хто вырашыў працаваць самастойна, дзяржава ўсклала вялікія падаткі: так, у красавіку 1922 г. Барысаўскі ўездны фінаддзел на ганчароў-саматужнікаў наклаў ураўнавальныя зборы ў памеры каля 45 мільёнаў рублёў на кожнага ў месяц, а штомесяц саматужнік вырабляў прадукцыі не больш чым на 100 мільёнаў. На аднаго саматужніка, які быў членам кааператыва, падатак складаў 3% [8, с. 107–112].

У межах НЭП ажыццяўлялася падтрымка дробных уласнікаў, арандатараў і канцэсіянераў, пераход буйных прадпрыемстваў да самаакупнасці і гасразліку, пераход да здзельнай аплаты працы (1923 г.), ліквідацыя главкаў, стварэнне трэстаў, сіндыкатаў і г.д. НЭП была накіравана на фарміраванне высокай прадукцыйнасці працы, дэцэнтралізацыю і лібералізацыю эканомікі. Нерэнтабельныя прадпрыемствы зачыняліся альбо часова кансерваваліся, а тыя, што не мелі для дзяржавы асаблівага значэння, маглі перадавацца ў арэнду кааператыўным арганізацыям альбо нават прыватным асобам. Арганізацыя працы пачала будавацца на прынцыпах матэрыяльнага стымулявання, была аднаўлена грашовая аплата працы, уведзены тарыфы зарплаты, ліквідавана ўраўнілаўка, што павінна было садзейнічаць хуткай ліквідацыі таварнага голада і пашырэнню тавараабароту паміж вёскай і горадам.

НЭП спрыяла колькаснаму росту рабочых і павышэнню прадукцыйнасці працы, таму ўжо ў 1922–1923 гаспадарчых гадах выпуск прадукцыі на 1 рабочага у буйной прамысловасці БССР перасягнуў узровень 1913 г., а ў 1927 г. прадукцыйнасць працы перавысіла даваенны ўзровень амаль у 1,8 раза. З 70 253 дробных прадпрыемстваў, якія дзейнічалі ў 1913 г. на Беларусі, у 1925–1926 гг. аднаўлена 60 178, а з 815 буйных прадпрыемстваў у 1926–1927 гг. працавала 420 [3, с. 3]. Такім чынам, працэс аднаўлення прамысловасці рэспублікі поўнасцю завяршыўся ў 1926–1927 гаспадарчых гадах. Камплектаванне прадпрыемств рабочаю сілаю ажыццяўлялася праз біржы працы, а заробак вызначаўся ў залежнасці ад выкананай працы. Аднавілася аплата транспарта, камунальных і іншых паслуг.

Паколькі НЭП дазваляла свабодны гандаль, у БССР даволі хутка аднаўляліся таварна-грашовыя адносіны, але прамы тавараабмен ажыццяўляўся паралельна з гандлем да восені 1922 г. Развіваліся разнастайныя віды гандлю – прыватны, дзяржаўны і кааператыўны. Упарадкаванне гандлю адбылося пасля стварэння дзяржаўнай падатковай службы, выкупа гандлярамі патэнта (ліцэнзіі) і ўплаты імі прагрэсіўнага падатка. На сярэдзіну 1920-х гг. была створана шырокая сетка буйных і дробных крам, дзе галоўнаю фігураю быў прыватнік. Акрамя таго, варта падкрэсліць, што ў сувязі з доўгім існаваннем у дарэвалюцыйны перыяд на Беларусі "мяжы аседласці" "нэпманамі" (уладальнікамі невялікіх крам і прадпрыемств) ў асноўным былі яўрэі, што прыводзіла да распаўсюджвання сярод іх ідэй сіянізму, а сярод мясцовага насельніцтва – зайздрасці, пагарды да яўрэяў і, як вынік, антысемітызму [2, с. 331–332].

Пачала аднаўляцца сувязь Беларусі са знешнім рынкам і за 1924–1925 гг. экспарт склаў каля 9 мільёнаў рублёў (да 1917 г. каштоўнасць сельгасэкспарту складала 18 мільёнаў, лесаэкспарт – 15 мільёнаў), аднак гэты аб'ём быў не большы за 1–1,255 ад агульнарасійскага экспарту (у даваенны час – 3%) [7, с. 163–164]. У банкаўскай сферы быў аднаўлены Дзяржаўны банк, ствараліся акцыянерныя і камерцыйныя банкі (1921 г.), адмянялася абмежаванне на захоўванне банкамі грашовых сум прыватных асоб і арганізацый, гарантавалася тайна ўкладаў. Адны і тыя ж прадпрыемствы, трэсты часта крэдытаваліся ў некалькіх банках адначасова і заўсёды мелі магчымасць звярнуцца за пазыкай у любы банк па сваім выбары.

Такім чынам, дзякуючы ажыццяўленню НЭП, уладам удалося спалучаць дзяржаўныя і асабістыя інтарэсы працоўных, была паспяхова аднаўлена сельская гаспадарка Беларусі, створаны ўмовы для развіцця прамысловасці, спажывецкі рынак быў напоўнены таварамі добрай якасці, павысіўся і сярэдні ўзровень жыцця. Разам з тым, трэба адзначыць, што НЭП нельга ідэалізаваць, бо і ў гэты час назіраліся значныя крызісныя з'явы: 1923 г. "крызіс збыту", 1925–1926 гг. "таварны голад", 1927–1928 гг. крызіс хлебанарыхтовак; ізноў з'явіліся бедныя і багатыя; гарады пакутавалі ад беспрацоўя. Шырокае распаўсюджванне атрымала дробная бытавая кантрабанда, калі сяляне абменьвалі прадукты за мяжою (пераважна ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне) на мыла, запалкі, цыгарэты, галантарэю і іншыя тавары. У маі 1922 г. створана Заходняя мытная акруга, якая абслугоўвала дзяржаўную мяжу ад Пскоўскай губерні да Украіны, а ў сакавіку 1923 г. распачала дзейнасць Беларуская раённая камісія па барацьбе з кантрабандай, якая адказвала за каардынацыю ўсіх органаў і грамадзянскіх арганізацый па барацьбе з кантрабандай. Усяго ў рэспубліцы было створана 9 мытняў. Для барацьбы з кантрабандай выкарыстоўвалася міліцыя, атрады асобага прызначэння, партыйныя і камсамольскія актывісты [3, с. 3].

**Заключэнне.** Згортванне і цяжкасці на шляху ажыццяўлення НЭП былі выкліканы ў першую чаргу тым, што НЭП не была забяспечана ідэалагічна і кіраўніцтва УКП(б) сістэматычна пераконвала працоўных, што шлях да лепшай будучыні ляжыць толькі праз індустрыялізацыю і калектывізацыю, а НЭП – гэта толькі "часовая мера". Больш таго, НЭП патрабавала ад тагачасных кіраўнікоў дзяржавы і іх акружэння не "класавай пільнасці", а прафесійнага ведання сваёй справы, чаго ў многіх з іх вельмі бракавала. З 1928 г. прадстаўнікі карных органаў пачынаюць накіроўваць "нэпманаў", якія, на думку савецкага кіраўніцтва, становяцца перашкодаю на шляху да будаўніцтва сацыялізму, у лагеры ГУЛАГа [7, с. 165]. Такім чынам, НЭП стварыла вялікія магчымасці для далейшага гаспадарчага адраджэння Беларусі, але не змагла вырашыць праблемы цалкам.

## СПІС ЦЫТАВАНЫХ КРЫНІЦ


1. Бяспалая, М.А. Эканамічнае развіццё беларускай вёскі (20–я гг. XX ст.) / М.А. Бяспалая // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 1. – С. 35–47.
2. История Беларуси. С древнейших времён до 2008 г. / Е.К. Новик, И.Л. Качалов, Н.Е. Новик; под ред. Е.К. Новика. – Минск: Высшая школа, 2010. – 526 с.
3. Кушнер, В.Ф. Новая эканамічная палітыка (НЭП) на Беларусі / В.Ф. Кушнер // Настаўніцкая газета. – 1997. – 2 красавіка. – С. 3.
4. Пархімовіч, М.М. Наёмная праца і арэнда зямлі ў беларускай вёсцы ў гады НЭПа / М.М. Пархімовіч // Первая мировая война: история, геополитика, уроки истории и современность (к 90–летию окончания Первой мировой войны и началу формирования Версальско-Вашингтонской системы международных отношений): материалы Международной научной конференции, Витебск, 11–12 ноября 2008 г., Витебский государственный университет им. П.М. Машерова. – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2008. – 321 с. – С. 219–221.
5. Сакович, В.С. Сельское хозяйство Беларуси: исторический очерк развития / В.С. Сакович // Белорусский экономический журнал. – 1999. – № 3. – С. 114–125.
6. Суманов, В.С. Опыт – сын ошибок трудных / В.С. Суманов // Финансы. Учёт. Аудит. – 2000. – № 5. – С. 30–33.
7. Эканамічная гісторыя Беларусі: курс лекцый / пад агульнай рэдакцыяй прафесара В.І. Галубовіча. – Мінск: Экаперспектыва, 1993. – 288 с.
8. Ярошук, С.В. Малая промышленность в условиях новой экономической политики (1921–1922 гг.) / С.В. Ярошук // Белорусский экономический журнал. – 1999. – № 3. – С. 107–113.


*Материал поступил в редакцию 10.11.14*

**HARMATNY V.P. NEP in Belarus (1921–1927)**

In the beginning of 1920-ies the economy of BSSR was totally destroyed especially agriculture. New Economical Policy (NEP) was proclaimed with aim of rebirth of destroyed economy. Thanks for NEP economy were partly increased but such policy was finished because it looks like capitalism.

УДК 94(4)|1914/1918|(=470.41)

***Грыбава С.У.***

# БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ Ў ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЕ

З моманту з'яўлення прадстаўнікоў татарскага этнаса на тэрыторыі Беларусі, што адбылося больш чым 600 гадоў таму назад, у часы існавання Вялікага княства Літоўскага, значнае месца ў іх асяродку займала вайсковая служба. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі дадзеная тэндэнцыя працягвала існаваць. У артыкуле размова пойдзе аб генералах з ліку татарскага насельніцтва беларускіх зямель на службе ў расійскай арміі, якія прымалі ўдзел у Першай сусветнай вайне.

Ваенныя з беларускіх татараў падчас згаданай вайны ўдзельнічалі ў арганізацыі мусульманскіх воінскіх часцей. У пачаўшымся фарміравацца летам 1917 г. на румынскім фронце 1-м мусульманскім корпусе яны складалі даволі значную частку. Ініцыятыва стварэння корпуса належыла генералу Мацею Сулькевічу, які і ўзначаліў яго (дарэчы, у «Известиях» Усерасійскай Мусульманскай Рады згадваецца аб стварэнні Сулькевічам у складзе корпуса трох дэвізій) [1, s. 248]. Мацей Сулькевіч нарадзіўся 20 ліпеня 1865 г. у сям'і дваран Віленскай губерні. Яго жыццёвы шлях быў прадвызначаны загадзя: бацька, Аляксандр Сулькевіч, быў палкоўнікам гусарскага палка і з малых гадоў Мацей выхоўваўся як будучы воін.

Пачатковую ваенную адукацыю М. Сулькевіч атрымаў у Варонежскім кадэцкім корпусе і Міхайлаўскай артылерыйскай школе. Яму не было яшчэ і 30 гадоў, калі ён скончыў ў 1894 годзе Акадэмію генеральнага штаба Расійскай імперыі. Службу ў царскай арміі ён пачаў ў 1883 г., а ў 1886 г. атрымаў першы афіцэрскі чын. У 1910 г. атрымаў званне генерал-маёра, а ў перыяд Першай сусветнай вайны – у 1915 г.– генерал-лейтэнанта.

М. Сулькевіч удзельнічаў у руска-кітайскай (1900–1901 гг.) і ў руска-японскай (1904–1905 гг.) войнах.

З першых дзён ўступлення Расійскай імперыі ў сусветную вайну генерал Мацей Сулькевіч знаходзіўся ў дзеючай арміі: спачатку на пасадзе начальніка штаба корпуса, затым на пасадах камандзіра 3-й пяхотнай дывізіі і камандзіра 37-га пяхотнага корпуса на Паўночным фронце.

За час службы ў царскай арміі М. Сулькевіч атрымаў мноства баявых узнагарод: ордэн Св.Станіслава, Св.Ганны 2-й ступені, Св.Уладзіміра 4-й ступені, Св.Уладзіміра 3-й ступені і інш.

Генерал Сулькевіч быў вядомы і як ваенны тэарэтык – артыкулы Сулькевіча па тэорыі і практыцы ваеннага майстэрства былі сабраныя і апублікаваныя ў двухтомніку, які карыстаўся поспехам не толькі ў Расіі, але і ў шэрагу еўрапейскіх краін. Трэба адзначыць, што татарын-мусульманін М. Сулькевіч, акрамя ваеннай справы, цікавіўся і папулярызаваў гісторыю, рэлігію і этнаграфію свайго народа. У 1902 г. ён на свае сродкі апублікаваў у друкарні Адэскай ваеннай акругі кнігу польскага арыенталіста, прафесара Пецярбургскага ўніверсітэта А. Мухлінскага «Даследаванне паходжання і становішча літоўскіх татараў» і напісаў уступ да гэтай кнігі [1, s. 248].

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі М. Сулькевіч з'ехаў у Крым. Імкнуўся да стварэння незалежнай крымскай дзяржавы. Пры падтрымцы германскіх войскаў, якія акупавалі паўвостраў ў красавікў 1918 г, сфармаваў Крымскі краявы ўрад, дзе заняў пасаду прэм'ер-міністра, міністра ўнутраных спраў і ваеннага міністра. Аднак гэты ўрад праіснаваў нядоўга. Адразу пасля выгнання германскіх войскаў у канцы кастрычніка 1918 г. Добраахвотніцкай арміяй А. Дзянікіна (пры падпрымцы саюзных французскіх і англійскіх войскаў) урад Сулькевіча быў распушчаны [2, s. 102]. М. Сулькевіч і яго паплечнікі пакінулі Крым і знайшлі прытулак у Азербайджане, дзе таксама прымалі актыўны ўдзел у палітычным жыцці. Мацей Сулькевіч меў дачыненне да арганізацыі азербайджанскай арміі, стаў ваенным міністрам. Але яго лёс склаўся трагічна: пасля захопу Баку бальшавікамі ён быў арыштаваны і расстраляны [3. с. 142].

Сваё жыццё прысвяціў вайсковай справе і Талькоўскі Аляксандр (Іскандэр) Асманавіч, які нарадзіўся 14 мая 1858 г. у Віленскай губерніі. Адукацыю атрымаў у прыватным рэальным вучылішчы Цэрбоўскага. Пасля заканчэння якога ў 1873 г. вырашыў ўступіць на службу ў армію, быў залічаны ў 107 Пяхотны Траецкі полк. Камандаванне, аценіўшы здольнасці Талькоўскага, накіравала яго ў жніўні 1874 г. у Віленскае пяхотнае юнкерскае вучылішча. Пасля заканчэння якога у 1876 г., Іскандэр Асманавіч вярнуўся ў свой полк. Праз год атрымаў званне прапаршчыка і быў прыкамандзіраваны да 9-га Грэнадзёрскага Сібірскага палка, у складзе якога прымаў удзел у руска-турэцкай вайне 1877–78 гг. Падчас вайны 16 лютага 1878 г. ён атрымаў сваю першую ўзнагароду – ордэн Св. Ганны 4-й ступені (за ўзяцце Плеўны), у красавіку гэтага ж года яму прысвоілі чарговае воінскае званне падпаручыка. Пасля вайны Талькоўскі быў накіраваны ў свой полк, дзе ён праслужыў на працягу 7 гадоў у якасці камандзіра роты і ў званні паручыка, і быў адзначаны румынскім крыжом у памяць вайны з Турцыяй.

За час службы ў палку адбыліся змены ў асабістым жыцці. Ён жаніўся на дачцэ ротмістра-татарына Лізавеце Сцяпанаўне Сулькевіч. У іх сям'і нарадзілася дзве дачкі і два сыны (адзін з якіх – Аляксандр – у свой час будзе генералам Чырвонай Арміі, падрабязней аб яго лёсе размова пойдзе ніжэй).

Улетку 1885 г. Талькоўскі падаў прашэнне аб пераводзе яго ў пагранічную варту, якое было задаволена. Яго служба ў Асобным корпусе пагранічнай варты працякала вельмі паспяхова. Руплівасць і стараннасць Талькоўскага былі не толькі заўважаны, але і адзначаны ў гэты перыяд трыма ўзнагародамі: ордэнамі Св. Станіслава 3-й ступені, Св. Ганны 3-й ступені і срэбным медалём у памяць царствавання імператара Аляксандра III.

36-гадовага ротмістра шанавалі не толькі за чалавечыя якасці, але і дзелавыя. Сведчаннем гэтага з'яўляецца яго камандзіраванне ў штаб Асобнага корпуса пагранічнай варты ў склад камісіі па распрацоўцы Палажэння аб кіраванні корпусам. Пасля завяршэння працы А.А. Талькаўскага пакінулі ў штабе корпуса. 1897 год прынёс яму новыя ўзнагароды: ордэн Св. Станіслава 2-й ступені і срэбны медаль у памяць каранавання імператара Мікалая II. 1 студзеня 1898 г. І.А. Талькоўскі прызначаны памочнікам старшага ад'ютанта штаба Корпуса пагранічнай варты. Праз тры месяцы яму прысвоілі чарговае званне падпалкоўніка. У красавіку 1901 г. ён быў узведзены ў палкоўнікі, а 25-гадовая служба адзначана ордэнам Св. Уладзіміра 4-й ступені. У снежні 1902 г. Талькоўскі атрымаў пасаду камандзіра Асобага Керчанскага аддзела. Яму даручалі весці сакрэтныя дазнанні. Яго заслугі былі адзначаны ў красавіку 1905 г. ордэнам Уладзіміра 3-й ступені, а ў чэрвені 1906 – пасадай камандзіра Чарнаморскай брыгады. Падчас службы на гэтай пасадзе Талькоўскі

***Грибова Светлана Владимировна**, ст. преподаватель кафедры социально-политических и исторических наук Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*